# ИСТОРИЯ БЕЛОРУССКО-КИТАЙСКОГО СОТРУДНИЧЕСТВА

**Руководитель секции: Прохоров А.А.**
*профессор кафедры истории древнего мира и средних веков исторического факультета БГУ,*
*кандидат исторических наук, доцент*

**УДК 327**

**Касцоў У.А.**
*студэнт гістарычнага факультэта БДУ*
**Навуковы кіраўнік: Страленя Г.А.**
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ,*
*кандыдат гістарычных навук*

## ФАРМІРАВАННЕ І РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКА-КІТАЙСКІХ ГАСПАДАРЧЫХ СУВЯЗЕЙ У 1992–2020 ГГ.: ЭТАПЫ І НАПРАМКІ

***Анатацыя:*** *у артыкуле разглядаюцца этапы і напрамкі двухбаковага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікі ў сферы эканомікі ў перыяд 1992–2020 гг.*

***Summary:*** *the article examines the stages and directions of bilateral cooperation between the Republic of Belarus and the People's Republic of China in the field of economics in 1992–2020.*

***Ключавыя словы:*** *Беларусь, Кітай, гаспадарчыя сувязі, дынаміка, тавараабарот, узаемадзеянне.*

***Keywords:*** *Belarus, China, economic relations, dynamics, trade turnover, interaction,.*

Беларуска-кітайскае супрацоўніцтва на сённяшні дзень з'яўляецца адным з найважнейшых напрамкаў знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Менавіта яму надаецца шмат

увагі пры абмеркаванні тэм партнёрства і эканамічнага ўзаемадзеяння. Супрацоўніцтва дасягнула значных вынікаў і мае дынаміку для далейшага эфектыўнага развіцця, што актуалізуе тэму дадзенага даследавання.

Афіцыйная гісторыя беларуска-кітайскага палітычнага і эканамічнага ўзаемадзеяння пачалася 20 студзеня 1992 г., калі была падпісана дамова аб усталяванні дыпламатычных адносін і гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве [5, с. 1]. Беларускі прафесар Мацэль В. М. вызначыў тры асноўныя этапы развіцця беларуска-кітайскіх гаспадарчых сувязей. Іх склад і ўнутраная перыядызацыя абумоўлены значнымі і пераломнымі падзеямі, якія моцна паўплывалі на асаблівасці і характарыстыкі акрэсленых этапаў. Цягам перыяду назіраецца ўстойлівы рост з патэнцыйным павелічэннем аб’ёмаў гандлю і інвестыцый у агляднай будучыні, што сведчыць пра плённасць і эфектыўнасць беларуска-кітайскага эканамічнага супрацоўніцтва.

**Першы этап** беларуска-кітайскіх гаспадарчых адносін – гэта этап фарміравання дагаворна-прававой базы і афіцыйны пачатак гаспадарчых адносін, ён ахоплівае перыяд з 1992 г. па 2005 г. Галоўнай яго рысай можна назваць заключэнне першых дамоўленасцей паміж дзвюма краінамі і фарміраванне першых аб’ёмаў тавараабароту з наступным іх павелічэннем. На 1992 г. агульны тавараабарот у гандлі Беларусі і Кітая склаў каля 33,9 млн долараў ЗША [3, с. 47]. Пры тым за Беларуссю на працягу ўсяго этапу захоўвалася пазіцыя станоўчага гандлёвага сальда.

Стабілізацыя сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь пасля 1994 г. спрыяла станаўленню краіны ў якасці стабільнага гандлёвага партнёра. Наступным крокам стала стварэнне Беларуска-Кітайскай камісіі (БКК) па гандлёва-эканамічным супрацоўнітцве ў верасні 1994 г. Можна ўзгадаць актывізацыю ўзаемадзеяння на высокім узроўні. Напрыклад, абмен візітамі Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь

С. С. Лінга ў Кітай і віцэ-прэм’ера Дзяржсавета КНР Лі Ланьціна ў Беларусь у 1996 г. [3, с. 150]. Падобная практыка стала частай з’явай ў беларуска-кітайскай дыпламатыі.

Першапачаткова беларускі экспарт у Кітай меў высокатэхналагічны характар, паколькі актыўна прадавалася прадукцыя з беларускіх прадпрыемстваў усіх тыпаў. Найбольш часта тут фігуруюць такія кампаніі, як «МЗКЦ», «Інтэграл». Асаблівую ролю мае кампанія «Беларуськалій», якая ў перыяд з 1996 г. па 1999 г. павялічыла аб’ёмы паставак сыравіны ў Кітай у 10,6 разоў. На 1999 г. агульны тавараабарот ацэньваўся ў 207,2 млн долараў ЗША з захаваннем станоўчага сальда для беларускага боку [3, с. 151-152]. Роля Кітая ў знешнім гандлі Беларусі паступова ўзрастала.

Трэба адзначыць, што пазіцыі Кітая ў двухбаковым супрацоўніцтве імклівымі тэмпамі ўзмацняліся разам з павелічэннем агульных аб’ёмаў тавараабароту, што было звязана з хуткім ростам кітайскай эканомікі. Калійныя ўгнаенні сталі вядучым таварам, які карыстаўся попытам у Кітаі і актыўна імпартаваўся. На 1999 г. іх доля ў агульным экспарце Беларусі ў Кітай склала каля 91 працэнта [3, с. 156].

Пачалася распрацоўка праграмы па актывізацыі беларуска-кітайскага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, зацверджаная ў сакавіку 2004 г. У 2005 г. баланс беларуска-кітайскага гандлёвага абароту пачаў схіляцца ў бок Кітая. Назіралася тэндэнцыя да стабілізацыі і паляпшэння сітуацыі праз рэгулярныя сустрэчы абодвух бакоў. Агульны тавараабарот паміж краінамі дасягнуў сумы ў 715 млн долараў ЗША ў 2005 г. [3, с. 156].

**Другі этап** беларуска-кітайскіх гаспадарчых адносін з’ўяўляецца этапам актывізацыі як палітычнага, так і эканамічнага супрацоўніцтва. Яго храналагічныя рамкі ахопліваюць перыяд з 2006 г. па 2013 г. Адпраўным пунктам з’яўляецца візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

А. Р. Лукашэнкі ў КНР у снежні 2005 г., у выніку чаго пачалася рэалізацыя праграмы па актывізацыі эканамічнага супрацоўніцтва. У двухбаковым гандлі для Беларусі ў 2006 г. складваецца адмоўнае сальда тавараабароту, роўнае 156 млн долараў ЗША [3, с. 158].

Захоўваецца тэндэнцыя перавагі экспарту калійных угнаенняў у параўнанні з іншымі таварамі, праз што беларускі экспарт мае сыравінны характар: сыравіна складае каля 78 працэнтаў [3, с. 156]. Па выніках 2006 г. агульны тавараабарот дасягнуў 1 млрд долараў ЗША ўпершыню ў гісторыі [3, с. 158]. Найбольш стабільна рос экспарт прадпрыемства прадукцыі «Беларуськалій». Прыкладна з 2007 г. беларускія кампаніі харчовай і лёгкай прамысловасці трапялі на кітайскі рынак [3, с. 162].

Імпарт з Кітая характарызаваўся набыццём высокатэхналагічнага абсталявання і камплектуючых для мадэрнізацыі беларускай эканомікі. Кітай укладваў інвестыцыі ў мадэрнізацію беларускай цеплаэнергетыкі. У 2008 г. агульны тавараабарот склаў 2,16 млрд долараў ЗША [3, с. 159]. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка наведаў КНР у 2008 г. Падчас візіту абмяркоўвалася тэма дыверсіфікацыі беларускага экспарту з актывізацыяй экспарту прадукцыі машынабудаўнічай, сельскагаспадарчай і іншай прамысловасці. Адной з актуальных праблем стаў шэраг непаразуменняў адносна якасці беларускай прадукцыі, якая пастаўлялася ў КНР [3, с. 163].

Падзеі 2008 г. акрэслілі праблему вузкай накіраванасці беларускага экспарту. Агульны тавараабарот у 2009 г. упаў да сумы 1,42 млрд долараў ЗША, што актуалізавала пытанне дыверсіфікацыі беларускага экспарту [3, с. 159]. У выніку кампаніі малочнай, харчовай і лёгкай прамысловасці Беларусі пачалі актыўна пранікаць на кітайскі рынак. Лён стаў адной з найважнейшых пазіцый беларускага экспарту ў Кітай [3, с. 163].

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка наведаў КНР у кастрычніку 2010 г., візіт стаў важным з пункту гледжання заключаных дагавораў і рэалізацыі агульных беларуска-кітайскіх транспартных і іншых праектаў. Абмяркоўваліся пытанні ўзаемадзеяння беларускіх і кітайскіх транспартных кампаній, дзе з беларускага боку выступалі «БелАЗ», «Гомсельмаш» і «МТЗ». Па выніках пяцігодкі 2006–2010 гг.. тавараабарот склаў 2,3 млрд долараў ЗША [3, с. 160].

Новая пяцігодка павінна была замацаваць прынцып дыверсіфікацыі беларускага экспарту. На момант 2011 г. доля калійных угнаенняў у экспарце склала 46 працэнтаў. Агульны тавараабарот працягваў рост і ў 2013 г. дасягнуў 3,3 млрд долараў ЗША. Акрамя таго, беларуска-кітайскаму супрацоўніцтву быў нададзены статус стратэгічнага [3, с. 160]. Беларусь далучылася да Эканамічнага поясу Шаўковага шляху (ЭПШШ) [2, с. 1]. Дадзены этап адзначыўся актывізацыяй, пачаткам дыверсіфікацыі гандлю, а таксама пашырэннем супрацоўніцтва ў іншых сферах.

**Трэці этап** беларуска-кітайскіх гаспадарчых адносін працягваўся з 2014 г. па 2020 г. і характарызуецца значнай інтэнсіфікацыяй гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. На дадзеным этапе двухбаковае ўзаемадзеянне выйшла на якасна вышэйшы ўзровень. Прэм’ер-міністр Беларусі У. М. Мясніковіч у студзені 2014 г. наведаў Кітай, дзе былі заключаныя 29 дамоўленасцей і 2 вялікія кантракты. Была падпісана дарожная карта на 2014–2018 гг. [3, с. 161].

У 2014 г. пачалася стварэнне высокатэхналагічнага Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парку «Great Stone» [1, с. 1]. У гэты год прасочваецца тэндэнцыя памяншэння аб’ёмаў імпарту з Кітая. Агульны тавараабарот склаў 3,01 млрд долараў ЗША. 10–12 мая 2015 г. Беларусь наведаў Старшыня КНР Сі Дзіньпін, падчас яго знаходжання ў Беларусі былі заключаныя 20 пагадненняў і мемарандумаў агульным коштам 3,5 млрд долараў ЗША [4, с. 1]. Дадзены

візіт стаў штуршком для далейшага паглыбення гандлёва-эканамічнага супрацоўнітцва. У жніўні Беларусь цалкам адмовілася ад рынку Тайваня. Кітай актыўна інвеставаў у беларускія транспартныя вузлы і іншую лагістыку, напрыклад, у Беларускую чыгунку (БЧ).

На момант новай пяцігодкі 2016–2020 гг. быў дасягнуты высокі ўзровень дыверсіфікацыі беларускага экспарту, як і ў мінулым, калійныя ўгнаенні выступалі вядучым кірункам экспарту. Прадукцыя беларускай лесаапрацоўчай прамысловасці пачала трапляць на кітайскія рынкі. У 2016 г. назіраўся спад у аб’ёмах агульнага тавараабароту да 2,59 млрд долараў ЗША. На момант 2017 г. з Кітая імпартавалася 977 таварных пазіцый, у той час калі экспартавалася з Беларусі – 195 [3, с. 167].

У 2018 г. Беларусь наведаў намеснік Старшыні КНР Ван Цішань. Беларускі бок падтрымаў ідэю аб стварэнні Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва. Працягвалася заваяванне кітайскіх рынкаў беларускай малочнай, харчовай і лесаапрацоўчай прамысловасцю [3, с. 168]. Доля калійных угнаенняў у беларускім экспарце працягвала змяншацца і на 2019 г. складала 45,5 працэнта.

Для беларуска-кітайскіх гандлёва-эканамічных адносін пандэмійны 2020 г. стаў памежным перад пачаткам наступнага этапу. Нягледзячы на сусветны крызіс, аб’ём тавараабароту павялічыўся і склаў 5,4 млрд долараў ЗША. Калійныя ўгнаенні склалі 42,8 працэнта ад усяго беларускага экспарту ў Кітай, што ў грашовым эквіваленце склала 320,7 млн долараў ЗША [3, с. 176-177]. Працягваўся актыўны рост экспарту прадукцыі іншых галін прамысловасці Рэспублікі Беларусь. Напрыклад, экспарт сельскагаспадарчых тавараў у 2020 г. павялічыўся на 194 працэнты ў параўнанні з 2019 г. Сусветны крызіс 2020 г. паказаў, што Беларусь і Кітай пабудавалі стабільную сістэму гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, якая здольная захоўваць рост нават у складаныя часы [3, с. 176-177].

Такім чынам, вызначаюцца тры асноўныя этапы развіцця беларуска-кітайскіх гаспадарчых і гандлёва-эканамічных адносін у перыяд з 1992 г. па 2020 г. Першы – этап дамоўленасцей і станаўлення гандлю. Другі – этап актывізацыі. Трэці – этап інтэнсіфікацыі. Паказчыкі гадлёвага абароту на 1992 г. склалі 33,9 млн долараў ЗША, а на 2020 г. – 5,4 млрд долараў ЗША.

Кожны з акрэсленых этапаў паказваў дынаміку ўстойлівага росту аб’ёмаў беларуска-кітайскага гандлю і эканамічнага супрацоўніцтва з яго паступовым пашырэннем і паглыбленнем. Былі выяўлены пэўныя пытанні, па вырашэнні якіх праводзілася паўсядзённая плённая праца. Дадзены макраперыяд паказаў зацікаўленасць абодвух бакоў у далейшым эфектыўным узаемадзеянні. Паступова Беларусь і Кітай здолелі праз шматлікія сустрэчы і візіты на найвышэйшым узроўні пабудаваць стабільную і перспектыўную праграму супрацоўніцтва. Моцны падмурак беларуска-кітайскай дыпламатыі забяспечвае афармленне наступнага – чацвёртага, яшчэ больш плённага этапу ва ўзаемадзеянні паміж краінамі.

## СПІС КРЫНІЦ:


*1. Аб Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку: Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 ліпеня 2012 г. № 253 // Кансультант Плюс: Версія Праф. Тэхналогія 3000 / ТАА "ЮрСпектр" М, 2012. – URL: https://president.gov.by/ru/documents/ukaz-253-ot-5 ijunja-2012-g-1492 (date of access : 19.02.2025).*

*2. Беларусь і КНР: Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва ў кантэксце рэалізацыі стратэгіі «Эканамічны пояс Шаўковага Шляху» : [сайт]. – URL: Journal2017_1-2_vfinal.indd (date of access : 19.02.2025).*

*3. Мацель В. М. Беларусь-Кітай: 30 гадоў па шляху дружбы і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва: [манаграфія] / В. М. Мацель ; Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі*

*Беларусь. – Мінск: Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, 2021. – 383 с.: Партр.*

4. *Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь: Дзяржаўны візіт Старшыні КНР Сі Цзіньпіна ў Беларусь : [сайт]. – Минск, 2025. – URL: https://president.gov.by/ru/events/gosudarstvennyj-vizit-predsedatelja-knr-si-tszinpina-v-belarus-11366 (date of access : 19.02.2025).*

5. *Пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай аб устанаўленні дыпламатычных адносін ад 20.01.1992 г. : [сайт] – Минск, 2008-2020. – URL: http://kaznachey.com/doc/4OzaY8mSfrb/ (date of access : 19.02.2025).*